

# Гістарычная палітыка: культурныя акцэнты

**Міністэрства культуры ажыццяўляе сістэму мерапрыемстваў па рэалізацыі Канцэпцыі гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Аб гэтым заявіў Анатолій Маркевіч падчас выступлення на Рэспубліканскім савеце па гістарычнай палітыцы.**

Па словах Анатолія Мечыслававіча, Міністэрства культуры, мясцовыя органы ўлады і ўстановы галіны праводзяць сістэму мерапрыемстваў па рэалізацыі Канцэпцыі гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Асаблівая ўвага надаецца перыяду зараджэння нашай дзяржаўнасці, з'яўленню БССР, барацьбе за захаванне тэрытарыяльнай цэласнасці Заходняй і Усходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайне, а таксама заснаванню суверэннай Рэспублікі Беларусь.

Задачай агульнанацыянальнага значэння міністр назваў аднаўленне першапачатковага аблічча Спаса-Праабражэнскай царквы ў горадзе Полацку — сімвала ўзнікнення дзяржаўнасці на беларускіх землях.

Прадметам глыбокага асэнсавання сталі падзеі, звязаныя з уз'яднаннем Заходняй і Усходняй Беларусі. Так, ва ўсіх музеях праходзяць выставы, прысвечаныя вызваленчай барацьбе супраць польскай акупацыі. Пастаянная экспазіцыя, што распавядае пра канцлагер у Бярозе-Картузскай, створана ў Бярозе. Па замове Міністэрства культуры тэлеканал "АНТ" зняў дакументальныя фільмы "Рана на целе Беларусі" і "Тры дні свабоды", Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" — тэлесерыял "Полымя пад попелам". Сёлета 17 верасня адбудзецца прэм'ера стужкі "На другім беразе". Аўтарскі калектыў пад кіраўніцтвам Канстанціна Касцючэнкі стварае скульптурную кампазіцыю "Беларусь — адзіная" на Кастрычніцкай плошчы сталіцы.

Анатолій Маркевіч таксама адзначыў, што ўстановы культуры вядуць сістэмную работу па захаванні гістарычнай праўды аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны. Арганізаваны новыя экспазіцыі ў Дзяржаўным мемарыяльным комплексе "Хатынь" і Музеі Канстанціна Заслонава ў Оршы. У цесным узаемадзеянні з Генеральнай пракуратурай праведзена больш за 3500 мерапрыемстваў па тэме генацыду беларускага народа, якія наведала звыш 170 тыс. чалавек.

З мінулага года ў школьнікаў ёсць права раз на месяц бясплатна бываць у любым музеі краіны. За 2022-і гэтую магчымасць скарыстала больш за 80 тыс. дзяцей і падлеткаў. Ужо два гады запар наведванне музеяў 9 мая з'яўляецца бясплатным для ўсіх грамадзян. Сёлета ў свята Перамогі ў рэспубліканскія музеі завітала амаль 152 тыс. чалавек, што ў 8,5 раза перавысіла колькасць гасцей у звычайны дзень.

Акрамя таго, у 2023-м заснаваны новы рэспубліканскі фестываль "Перамога", у якім удзельнічалі тэатры Брэста, Пінска, Гродна, Гомеля, Бабруйска і Мінска. Яшчэ аб'яўлены конкурс п'ес пра партызанаў і падпольшчыкаў.

Шырокі грамадскі рэзананс выклікалі патрыятычныя форумы "Сімвал адзінства" і "Гэта наша гісторыя" да Дня народнага адзінства, канцэртныя праграмы да Дня Перамогі і Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Таксама Міністэрства культуры падтрымала студэнцкі праект БДУКМ "На гэтай плошчы гісторыя мая..." пра герояў мінскага падполля. Плануецца зрабіць падзею штогадовай і праводзіць яе ў розных рэгіёнах краіны.

На завяршэнне выступлення Анатолій Маркевіч унёс прапановы па фарміраванні электроннай базы дадзеных аб нацыянальных героях, якая магла б служыць асновай для распрацоўкі сюжэтаў твораў мастацтва, і аб вызначэнні месца ўзвядзення новага будынка Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі з маштабнай сучаснай экспазіцыяй, што адлюструе ўсе перыяды айчыннай мінуўшчыны.